**УСТАЎНАЯ КАНСТРУКЦЫЯ**, інтанацыйна ізаляваная ад асноўнай структуры сказа канструкцыя (слова, словазлучэнне, сказ), якая ўносіць у сказ дадатковыя заўвагі, ўдакладненні, папраўкі. Устаўкі тлумачаць ці ўдакладняюць сказ у цэлым, прэдыкатыўную частку складанага сказа ці асобнае слова, напрыклад: *Над усёю зямлёю трапічныя зоры, адбіваюцца пальмы ў цёплай вадзе. (Я, напрыклад, ніколі не бачыў мора, як мільёны іншых звычайных людзей)* (У. Караткевіч); *Сонца яшчэ не ўзышло – зімою, калі і хмар няма, яно паказваецца недзе толькі к абеду, – але ў вёсцы было светла, чыста і празрыста* (Я. Сіпакоў); *Памочніцамі і апірышчам Еўфрасінні ў шматлікіх клопатах і пачынаннях сталі яе сёстры: родная Гардзіслава (у манастве Еўдакія) і стрыечная Звеніслава (Еўпраксія)* (У. Арлоў); *Зноў восень гаспадыняю прыйшла і з новай збажыны – у дзве асьміны – духмяных караваяў напякла, а жар павыграбала на асіны* (Р. Барадулін).

Вымаўляюцца ўстаўныя канструкцыі з паніжэннем тону і больш хуткім тэмпам, выдзяляючыся паўзамі.

Традыцыйна лічыцца, што ўстаўныя канструкцыі граматычна не звязаны са сказам, а прымацоўваюцца да яго сэнсавай (суадноснай) сувяззю пры дапамозе злучнікаў (злучальных і падпарадкавальных), злучальных слоў ці без іх дапамогі: *А запаліш – дым, як з паравоза (бо гарыць салярка – не бяроза!)* (Р. Барадулін); *Траўка вылезла ў канаўцы, а ў бары – чуваць за мілі – музыканты-выканаўцы конкурс майскі аб явілі* (Н. Гілевіч).

Некаторымі даследчыкамі ўстаўныя канструкцыі разглядаюцца ў складзе пабочных (напрыклад, аўтарамі некаторых школьных падручнікаў), аднак большасць мовазнаўцаў кваліфікуюць устаўкі як самастойную сінтаксічную катэгорыю, якая выконвае спецыфічную функцыю і мае адметную структуру. У адрозненне ад пабочных устаўкі не выражаюць мадальных значэнняў, не паказваюць на крыніцу паведамлення і пад., а пашыраюць інфармацыйны змест выказвання: тлумачаць, удакладняюць ці паясняюць сэнс папярэдніх слоў, словазлучэнняў ці цэлых сказаў. Устаўныя канструкцыі размяшчаюцца ў сярэдзіне ці ў канцы асноўнага сказа: *Традыцый многа павялося. Між іншых люблю я адну, калі – ці то зімой, ці ўвосень – сусед суседа шчыра просіць на навіну, на свежыну* (Р. Барадулін); *Князь Раман Усяслававіч, удава якога стаяла на чале манастыра, памёр каля 1116 года (па іншых звестках – у 1113)* (У. Арлоў).

У навуковай і лінгваметадычнай літаратуры паводле будовы сярод устаўных канструкцый адрозніваюць:

– устаўныя сказы і групы сказаў: *Лепей сто разоў на слове збіцца (дараваў бы ў сто разоў хутчэй), чым паперкаю адгарадзіцца ад гарачых сэрцаў і вачэй!* (Н. Гілевіч); *Праз нейкі час пры царкве Багародзіцы падзвіжніца стварае яшчэ адзін манастыр – мужчынскі. Гэта таксама быў подзвіг: тады, на пачатку XII стагоддзя манастыроў у Полацкім княстве існавала няшмат. (А мужчынскага манастыра Прасвятой Багародзіцы да нашых дзён не захавалася ніякіх слядоў. Месца, дзе ён стаяў, дакладна невядомае, але ў часы Еўфрасінні была завядзёнка будаваць загарадныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*жаночыя і мужчынскія манастыры ў блізкім суседстве, каб у выпадку небяспекі манахі баранілі дзве цвярдыні…)* (У. Арлоў);

– устаўныя словы, спалучэнні слоў і словазлучэнні: *Адыходам ад ранейшых канонаў вылучаліся царква-пахавальня полацкіх епіскапаў, храмы Бельчыцкага (Барысаглебаўскага) манастыра, заснаванага ў Полацку на мяжы XI – XII стагоддзяў* (У. Арлоў). *Не вярнуць наноў – можна не старацца – Белацвет садоў, жаўтацвет акацый* (М. Шабовіч). *А маці – наўздзіў маладая – гладзіць мяне рукою па галаве, дзьмухае мне на твар…* (А. Разанаў);

– устаўкі з непаўназначных элементаў: *Сцюдзёна – брр! – мыцца халоднаю вадою зімой* (М. Лынькоў).

У залежнасці ад асаблівасці граматычнай сувязі са сказам сярод устаўных канструкцый вылучаюцца ўстаўкі неканструкцыйнага тыпу і ўстаўкі канструкцыйнага тыпу.

**Устаўкі неканструкцыйнага тыпу** – гэта такія ўстаўкі, якія граматычна ўключаюцца (упісваюцца) у структуру сказа як яго члены ці даданыя часткі: *Спявалі дрэвы і – няхай ціхім, але неадольным спевам – адгукалася сэрца* (І. Мележ); *Цікавую кнігу – на простай і зразумелай роднай мове – я чытаў і перачытваў многа разоў…* (Н. Гілевіч); *А ля калодзежаў паўтыканы ў снег жэрдкі (каб не ўваліцца, як замяце)* (А. Жук); *Радзіма Еўфрасінні – Полацкае княства, моцная раннефеадальная ўсходнеславянская дзяржава, якой два з паловай стагоддзі кіравала самастойная дынастыя Рагвалодавічаў, або Ізяславічаў (калі лічыць ад князя Ізяслава – унука Рагвалода і сына Рагнеды)* (У. Арлоў). Некаторыя даследчыкі (М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко) устаўкі неканструкцыйнага тыпу, выражаныя словамі ці спалучэннямі слоў, кваліфікуюць як факультатыўна адасобленыя члены, звязаныя граматычнай сувяззю з іншымі кампанентамі сказа.

**Устаўкі канструкцыйнага тыпу** – гэта такія ўстаўкі, якія не ўключаюцца (не ўпісваюцца) у граматычную структуру сказа: *Я дзякую сябрам за дружбу (Інакшых не хачу сяброў), Зямлі – за хлеб, лясы і ружы, Сям' і – за чуласць і любоў* (П. Панчанка); *Тады доўга варочаюцца на сваіх канапах і раскладушках вясковыя бабулькі, якія на зіму прыехалі ў горад, каб даглядаць сваіх унукаў (на лета яны забяруць іх з сабою), варочаюцца доўга…* (Я. Сіпакоў); *Жанчына ля іржэўніка сядзіць (мо сівізна ў касе, мо павуцінне) і думае і ў далячынь глядзіць, дзе жоравы лятуць імклівым клінам* (У. Караткевіч).

Устаўныя адзінкі неканструкцыйнага і канструкцыйнага тыпу выконваюць у сказе разнастайныя сэнсавыя функцыі, якія спрыяюць іх выкарыстанню ва ўсіх стылях мовы. Асноўныя з іх – тлумачальная, удакладняльна-паясняльная і эмацыйна-экспрэсіўная (Чалюк Н.М.).

Тлумачальная функцыю рэалізуюць устаўныя канструкцыі, якія раскрываюць значэнні ўстарэлых, новых, дыялектных слоў, вузкаспецыяльных тэрмінаў як шляхам дакладнага іх азначэння, так і праз сінанімічнае супастаўленне: *На плечы Багародзіцы ўрачыста падае мафорый (жаночы галаўны ўбор) з па-майстэрску намаляванымі складкамі* (У. Арлоў);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Ёсць і іншая назва ў гэтага адрэзка геалагічнай гісторыі – антрапаген (па-грэчаску антропас – чалавек, а генас – паходжанне)* (Э. Ляўкоў); *Лексічныя архаізмы, г. зн. устарэлыя словы, якія сваім марфалагічным складам поўнасцю адрозніваюцца ад сучасных назваў: злічво (сума), раме (плячо), самаезд (аўтамабіль)* (В. Красней); *Было нямала спроб растлумачыць назву “Літва”. Адзначым некаторыя з іх. У “Хроніцы Быхаўца” яна выводзіцца з “літус” (бераг) і “луба” (труба)* (М. Ермаловіч); *У мінулым стагоддзі, калі шафаў, вядома, не было, а ў куфры (скрыні) не ўсё змяшчалася, тут* [у хаце] *стаялі і “кублы” з лішнім адзеннем і іншым дабром* (У. Караткевіч).

Удакладняльна-паясняльная функцыя характэрна для ўставак, якія паясняюць выказванне ў цэлым ці асобныя яго кампаненты (канкрэтызуюць значэнне ўласных назоўнікаў; удакладняюць агульнае родавае паняцце шляхам указання на асобныя яго віды; раскрываюць значэнні займеннікаў; служаць для выдзялення найбольш важнай часткі выказвання; выконваюць службовую функцыю, з’яўляючыся спасылкамі; удакладняюць змест асноўнага выказвання, указваючы на месца, час і розныя абставіны яго ажыццяўлення і інш.): *Шырокі дыяпазон жыццёвага матэрыялу (гістарычнае мінулае, Айчынная вайна, першыя пасляваенныя гады, сучаснасць), жанравая шматстайнасць – раман, аповесць, апавяданне, мініяцюра, – свежасць і разнастайнасць апавядальнай манеры, дзе найбольш пашырана апавяданне ад першай асобы, – усё гэта ўласціва Сачанку-празаіку* (С. Андраюк); *За дрэвамі ў цемры ёй малявалася страшнае – ваўкі, мядзведзі, – але неадольная сіла вабіла ў загадкавую глыбіню* (І. Мележ); *Губаты – так ужо выйшла – застаўся ў лесніковай гаспадарцы* (Г. Даліловіч); *Парог пасечаны, чурпаты (зрабіў яго чарнейшым час): Зімой дрывотняй і варштатам служыў ён удаве не раз* (Р. Барадулін). *У 19 ст. узніклі фортавыя абарончыя збудаванні (гл. Крэпасць) з вынесенымі на 1-2 км наперад ад цэнтральнага ўмацавання фортамі* (“Літаратура і мастацтва Беларусі”).

Эмацыйна-экспрэсіўная функцыя ўласціва ўстаўным адзінкам, якія перадаюць аўтарскія эмацыянальна-ацэначныя тлумачэнні і характарыстыкі выказвання: *Клімук наш арбіту высока ўзняў (Дзе вашы песні, паэты?), слуцкім поясам падперазаў сотні разоў планету* (П. Панчанка); *А на праспекце – божа мой! – Пад вечар асабліва – Дзяўчаты сноўдаюць гурмой, стрыгуць вачмі гулліва* (Н. Гілевіч); *У маленстве, калі ты вяртаўся з коўзанкі мокры, маці – па-свойму вельмі правільна, а па-твойму зусім незаслужана – сустракала цябе пякучымі махрамі фартуха, ты найчасцей забіраўся на печ* (Я. Брыль); *Нарэшце клюнула разок – І рыбка немалая! – З пяром гусіным паплавок Пад воблака нырае* (А. Куляшоў); *І мне цябе ніколі не забыць, Хоць – што тут зробіш? – мы з табой не пара* (М. Шабовіч).

Устаўныя канструкцыі – адметны спосаб выражэння разваг, суджэнняў, меркаванняў, ацэнак, што тлумачыць іх шырокае ўжыванне ў навуковым, публіцыстычным стылях і стылі мастацкай літаратуры.

*С.С.Мароз*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ